# Дзе прыжывецца сімвал продкаў?

**У сімвалах, што дайшлі да нашых дзён у аздобе квяцістых посцілак, саматканых абрусаў і ручнікоў, зашыфраваны код беларускай нацыі, які спакваля вяртаецца ў сучаснасць беларускімі вышыванкамі, узорамі на гарадскіх забудовах і вясковых вуліцах.**
**Нядаўна грамадскасцю сталіцы выказана яшчэ адна прапанова — да 100-годдзя аховы здароўя ўвекавечыць сімвал беларускага арнаменту — знак жыцця — на тэрыторыі БДМУ.**
**У абмеркаванні гэтай ідэі ўзялі ўдзел вядомыя асобы, нераўнадушныя да традыцый і гісторыі краіны**



**Валянціна Курсевіч,**
намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

У скарбніцы духоўнай культуры захоўваюцца каштоўныя веды пра сусвет, прыроду, жыццё чалавека, перад якімі заўсёды стаяла няпростая задача: звязаць паміж сабой мінулае, сучаснае і будучае.

У медыцыне з даўніх часоў найбольш распаўсюджанымі лічацца чатыры сімвалы. Самы вядомы з іх – чаша са змяёй. Гэтая выява знаёмая з часоў Авіцэны, які лячыў пацыентаў змяіным ядам. Вобраз стражытнагрэчаскай багіні здароўя Гігеі атаясамліваўся з жанчынай са змяёй. Не менш вядомы яшчэ адзін сімвал – кій старажытнагрэчаскага лекара Асклепія са змяёй. Ёсць паданне, што Асклепій, убачыўшы, як на яго кій запаўзае змяя, забіў яе. І тады да кія падпаўзла другая, каб з дапамогай зёлак ажывіць забітую... Існуе сімвал чырвонага крыжа і чырвонага паўмесяца, якія звязаны з дзейнасцю міжнароднай арганізацыі. І чацвёрты сімвал ужо з 20-га стагоддзя. Гэта шасцівугольная зорка жыцця, якой карыстаюцца службы экстраннай дапамогі ў ЗША.

Знак жыцця на тэрыторыі БДМУ – гэта вельмі лагічна. Сімвалічна.

> Жыццё і медыцына – непарыўныя паняцці Урач побач са сваім пацыентам – ад нараджэння і да скону. Выратаванае жыццё, магчымасць радавацца яму – самы вялікі прафесійны здабытак кожнага медыцынскага работніка...

Я нарадзілася ў вёсцы Суботнікі Іўеўскага раёна. Да гэтага часу памятаю цудоўныя тканыя ручнікі маёй бабулі Ганны з загадкавымі тады для нас, савецкіх дзяцей, геаметрычнымі ўзорамі, сярод якіх, безумоўна ж, быў і гэты нацыянальны сімвал, які вяртаецца сёння нашчадкам. Гэта наша нацыянальная адметнасць і прафесійны гонар. Такое вяртанне не можа не радаваць.



**Яўген Сахута,**
вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

Асноўная сімволіка беларусаў захавалася ў нас на ручніках, на традыцыйным адзенні ў такім выглядзе, як яна, магчыма, была і сотні гадоў таму. Гэта ромбагеаметрычны арнамент сімвалічнага чырвонага колеру на белым фоне. У старажытнасці кожны такі знак нешта абазначаў і меў сімвалічнае значэнне. Стары ручнік можна было чытаць як паэму народнага жыцця, у якой занатаваны погляд беларуса на прыроду, гісторыю, чалавечыя ўзаемаадносіны. Праблема ў тым, што нашы навукоўцы гэтым пытаннем позна зацікавіліся.

Ужо ў канцы 19-га стагоддзя сэнс беларускай сімволікі стаў губляцца. Пачалі з'яўляцца вышываныя ўзоры расліннага кшталту. Ромбагеаметрычныя знакі прадаўжалі жыць на старых вырабах, але новае пакаленне забывалася пра іх сэнс. Ніхто ўжо не прытрымліваўся ні каларыстыкі, ні сімволікі. А калі нашы навукоўцы спахапіліся і перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны яшчэ паспелі нешта зрабіць у гэтым накірунку, дык гэта ўжо быў вельмі позні пласт, дзе шмат выдуманага, самадзейнага і сэнс сімвалаў далёка не бясспрэчны. Таму не ўсё тое, што маем сёння, можна прымаць як абсалютныя вынікі.

Сонечны знак — ромб з адросткамі. У старажытнасці ён абазначаўся кругам з адросткамі, але ж у ткацтве, дзе ёсць толькі вертыкальны і гарызантальны ракурсы, круг не атрымаецца. Таму ён трансфармаваўся ў ромб. Усе навукоўцы, якія вывучаюць славянскую культуру, схіляюцца да таго, што гэта сонечны знак. Нашы продкі пакланяліся сонцу, якое ім свяціла ўсё жыццё. Безумоўна, гэта быў цэнтральны знак. Дарэчы, усе яны мелі сімвалічнае абярэгавае значэнне.

Знак жыцця ў кнізе Міхаіла Кацара «Беларускі арнамент» падаецца як спалучэнне двух сімвалаў — сонца (ромб з адросткамі) і зямлі (такі ж ромб, але адросткі накіраваны ўнутр). Відаць, такі сімбіёз не выпадковы: спалучэнне энергіі сонца і зямлі дае жыццё. Гэты сімвал цалкам лагічны, традыцыйны.

Пахвальна тое, што сёння расце цікавасць да традыцыйнай сімволікі, якую можна ўбачыць і на вышываных кашулях, і на кубачках, і ў архітэктурным асяроддзі. Ідэя абазначыць старажытны сімвал жыцця на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта заслугоўвае ўвагі. Другая справа — як яе ўвасобіць, як падаць. Тут ужо трэба весці размову са спецыялістамі: архітэктарамі, скульптарамі, мастакамі-дызайнерамі і г. д. Але ж, скажам, у Полацку ўсё-такі змаглі ўвасобіць у гарадскую прастору ў аб'ёмным скульптурным варыянце літару Ў. Атрымалася арыгінальна і запамінальна. Думаецца, знак жыцця таксама можна ўвасобіць у таленавітым дызайнерскім рашэнні, але тут ўжо, пэўна, спатрэбіцца і надпіс, і творчы падыход.



**Янка Крук,**
этнакультуролаг, кандыдат філал. навук

Кожная краіна мае свой герб, свой гімн. Дзеля чаго? Перш за ўсё гэта пазнавальныя знакі, якія аб'ядноўваюць людзей. А таму такія сімвалы, як знак жыцця, нам неабходныя, каб пазначыць нашу адметнасць.

...Неяк у Навасібірску я сустракаўся з перасяленцамі-беларусамі. Калі яны з Магілёўшчыны трапілі ў Сібір, дык забралі з сабой калыску, у якой выгадавалася пяць пакаленняў. Калыска ў гэтай сям'і была сімвалам паяднання рода. Але наступная маладая сям'я не пажадала больш класці ў тую калыску сваё немаўля. Старэйшы мужчына ў сям'і, расказваючы, плакаў. Яго ўзрушыла гэтая падзея: адмова ад традыцыі перапыніла іх родавую ўзаемасувязь. Мы таксама не павінны страціць гэтую повязь.

Ёсць і іншыя паралелі. Імкненне да экалагічна чыстых прадуктаў стала вельмі моднай тэндэнцыяй. Асабіста я ведаю цудоўнага фермера, які гадуе статак коз у гаспадарцы недалёка ад сталіцы. Казінае малако і іншыя малочныя прадукты з гэтай гаспадаркі маюць спецыяльную пазнаку экалагічна чыстага прадукта. Гэта добрае памкненне, аднак калі мы будзем набываць у краме «чыстыя» прадукты і пры гэтым будзем дыхаць не зусім чыстым паветрам і піць не надта чыстую ваду, то карысці практычна не будзе. Так і ў нашай сітуацыі. Трэба глядзець на праблему не фрагментарна, а канцэптуальна.

Важна правільна падаць гэты сімвал. Міжволі прыгадваецца гісторыя, якая адбылася ў адным з райцэнтраў Магілёўшчыны. Там на плошчы ўсталяваны знак удачы — падкова, якая, як лічаць у народзе, прыносіць шчасце. Яна там... дагары рожкамі. Давайце ўспомнім: дуга на падводзе ў форме аркі (падковы), маці над маладымі ў час вяселля трымае ручнік у форме аркі (падковы) — на шчасце і г. д. Такім чынам падкова набывае іншы сэнс. Процілеглы. І гэта ўжо не абярэг і не той сімвал продкаў, што прыносіць шчасце.

Не варта забыцца пра тое, што нашы дактары выконваюць найскладанейшыя ўмяшанні, якія могуць глабальна ўпісацца ў сусветны вопыт, і таму, відаць, не пашкодзіла б не толькі падпісаць гэты знак, даўшы пэўную інфармацыю, але і дадаць нейкі сучасны штрых.

Источник: "Медицинский вестник" - 2019-04-25

# Узоры жыцця

**«Вышываюць гэты ўзор тады, калі трэба прасіць Бога, каб ачуняў чалавек, — тлумачыла майстрыха Е. Берагавінава (вёска Абольцы Талачынскага р-на) характэрны арнамент на сваім вырабе. — А яшчэ калі ў бабы няма дзяцей». Скампанаваны гэты ўзор з дзвюх частак: ромб з адросткамі-прамянямі — сонца, такі ж ромб, але прамяні накіраваны ўнутр — зямля. Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця, сімвал сонца змяшчаецца ў сімвал зямлі.**

**...Узор, які спалучае сімвалы зямлі і сонца, шырока вядомы ў беларускім ткацтве. Калісьці яго можна было бачыць у кожнай сялянскай хаце, паколькі ён лічыўся цудадзейным. Называюць яго па-рознаму: жыццё, вясна, Ярыла. Гэта адзін з найстаражытнейшых сімвалаў, у якім зашыфравана вялікая таямніца жыцця».**

(З кнігі Міхаіла Кацара «Беларускі арнамент».)



**Сяргей Сергачоў,** загадчык кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў БНТУ, доктар архітэктуры, прафесар

Не першы год займаюся народнай архітэктурай і яе гісторыяй, і мне, безумоўна, імпануе ідэя з'яўлення старажытнага сімвала беларусаў — знака жыцця — на тэрыторыі медыцынскай навучальнай установы сталіцы. У апошні час у нашым гарадскім асяроддзі з'яўляецца шмат розных скульптур і знакаў. Праўда, яны не заўсёды выклікаюць сімпатыю, асабліва перакошаныя, змучаныя, з парушанай анатоміяй. Мы, архітэктары, гэтаксама як і ўрачы, супраць парушанай анатоміі. У чалавечым арганізме, як і ў архітэктурным асяроддзі, усё павінна быць гарманічна. Гэта добра, калі з'явіцца такі знак, але важна, як яго падаць.

Я добра ведаю гэты сімвал і яго каштоўнасць. Знак жыцця будзе інфармаваць прыналежнасць тых, хто вучыцца ў медыцынскім універсітэце, да найвялікшай каштоўнасці чалавека — яго жыцця. Нават узоры на вокнах звычайнага сялянскага дома нясуць інфармацыю пра яго гаспадара. Чаму б і гэтаму вялікаму дому, дзе вучацца тысячы будучых дактароў, не мець свой узор, які застаўся нам ад продкаў? Мы наіўна доўгі час лічылі сваіх дзядоў і прадзедаў не вельмі пісьменнымі людзьмі, але ж, як высветлілася, іх думкі і перажыванні былі вельмі глыбокімі: старадаўнія сімвалы неслі шмат філасофскай спрадвечнай інфармацыі. Яны прыдумалі такую лакальную форму знакаў, якую можна было выкарыстаць у любой форме прыкладнога мастацтва.

Міжволі прыгадваецца адна з паездак у ЗША. Неяк аднойчы, шпацыруючы па вуліцах Філадэльфіі, заўважыў у цэнтры горада дзіўны помнік у выглядзе… вялізнай прышчэпкі для бялізны, але не драўлянай, а пластмасавай, вышынёй з чатырохпавярховы дом. Магчыма, тут некалі было прадпрыемства, дзе рабілі гэтыя прышчэпкі, ці што-небудзь яшчэ, але відавочна, гэта стала адметнасцю горада: тут фатаграфуюцца, прыходзяць на экскурсіі і г. д.

Мы заўсёды шукаем, часам інтуітыўна, ідэнтыфікацыю з месцам і той зямлёй, дзе нарадзіліся. У гэтым дапамагае народная творчасць. Я добра ведаю беларускі арнамент і яго знакі, сярод якіх ёсць і знак жыцця. Пра гэта гавару са сваімі студэнтамі, якіх навучаю любові да родных вытокаў і адчуванню гармоніі. У 1980-я гады ў час экспедыцыі ў Чачэрскі раён мы ўбачылі незвычайнае селішча: хаты ўжо не было, а хлеў застаўся. Там, як мне распавялі вяскоўцы, засталося месца гаючай энергетыкі: хворага закручвалі ў саматканыя ручнікі, на якіх былі вытканы старадаўнія сімвалы, і з малітвамі вялі ў гэтую прастору, дзе чалавек набіраўся сілы і ўрэшце ачуньваў. Прыводзілі хворых з навакольных вёсак.

Падчас паездак па Беларусі ў некаторых вёсках даводзілася бачыць старадаўнія сімвалы ўрадлівасці і багацця, пажаданні дабра га ўраджаю і дабрабыту. Думаю, адметны знак будзе спрыяць і студэнтам медыцынскай навучальнай установы авалодваць самай гуманнай прафесіяй, якая заўсёды на варце здароўя чалавека і яго жыцця.

> Радуе тое, што сёння старадаўнія сімвалы вяртаюцца з забыцця. Цяпер важна знайсці правільнае месца для гэтага знака і яго ўдалае мастацкае вырашэнне. Пры гэтым улічваць усе акалічнасці, нават тое, як будзе ўспрымацца гэты знак у розны час сутак.



**Павел Маркауцан,** проректор по воспитательной работе БГМУ, доцент, кандидат мед. наук

Для белорусов символы орнамента были неотъемлемой частью жизни. Белорусские женщины выражали свои чувства через вышивку, вкладывая в работу душу и выполняя ее с большой любовью. Носили вышитую одежду с гордостью и твердой верой в ее символичность. Каждый узор содержал жизнеутверждающий смысл. Эта неодолимая сила жизни передавалась из поколения в поколение. И сегодня она сохранила свою притягательность. Все больше молодых белорусов носят одежду с узорами жизни. Поэтому мы бы хотели, чтобы таким символом для будущих врачей стал белорусский орнамент в виде вертикальных орнаментальных линий.



**Васіль Аверын,** загадчык кафедры дзіцячай хірургіі БДМУ, прафесар, доктар мед. навук

Мяркую, што выкладчыкам і студэнтам нашай медыцынскай установы патрэбен такі сімвал, каб не быць «Іванамі бязроднымі». Думаю, гэта будзе дабратворна ўплываць і на свядомасць будучых урачоў. У нашай навучальнай установе існуе падмурак для таго, каб маладыя людзі адчувалі тут не толькі прафесійную, але і нацыянальную прыналежнасць. Ва ўніверсітэце ёсць кафедра і рускай, і беларускай мовы, дзе не так даўно выпусцілі слоўнік медыцынскіх тэрмінаў у перакладзе на беларускую мову. Ёсць яе прыхільнікі сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Калі, скажам, я чытаю студэнтам лекцыі пра гісторыю развіцця дзіцячай хірургіі на Беларусі, раблю гэта выключна на роднай мове.

Я нарадзіўся ў Маладзечне і на працягу ўсяго жыцця не губляў повязь з малой радзімай, дзе з павагай ставяцца да роднага слова, народнай музыкі і культуры. Але ж разумею, што гэтага сёння недастаткова. У прыватнасці, хацелася б надаць больш нацыянальнай адметнасці і нашай навучальнай установе. Важна, каб будучыя ўрачы заўжды з гонарам казалі: «Мы вучыліся ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце!», а сімвал продкаў — знак жыцця — стаў бы сапраўдным брэндам беларускіх студэнтаў-медыкаў.

**Святлана Хорсун,** «МВ».